**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# ВІТАН-ДУБЕЙКАЎСКАЯ ЮЛЬЯНА

**ГРАМАДСКА-КУЛЬТУРНЫ ДЗЕЯЧ**

**30 ЛІСТАПАДА 1886 Г. – 28 ВЕРАСНЯ 1969 Г.**

**ФОНД № 505**

**ВОПІС № 1**

**1915–1994 гг.**

**МІНСК 2023**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1** **ф. 505**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Ю. ВІТАН-ДУБЕЙКАЎСКАЙ | 1-7 | 1-2 |
| 2. | ПЕРАПІСКА | 8-13 | 2-3 |
| 2.1. | ПІСЬМЫ Ю. ВІТАН-ДУБЕЙКАЎСКАЙ | 8-10 | 2 |
| 2.2. | ПІСЬМЫ ДА Ю. ВІТАН-ДУБЕЙКАЎСКАЙ | 11-13 | 2-3 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Ю. ВІТАН-ДУБЕЙКАЎСКАЙ І ІНШ. | 14-19 | 3 |
| 4. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 20-28 | 3-4 |
| 5. | ДАКУМЕНТЫ ЧЛЕНАЎ СЯМ'І Ю. ВІТАН-ДУБЕЙКАЎСКАЙ | 29-30 | 4-5 |
| | СПІС КНІГ | | |
| | СПІС МУЗЕЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ | | |

## Прадмова

**Вітан-Дубейкаўская Юльяна-Алена** (да шлюбу – Менке (Moenke), псеўданім – Кветка Вітан) нарадзілася 30 лістапада 1886 г. у нямецкай купецкай сям'і ў Вільні. У 1895–1905 гг. вучылася ў Віленскай прыватнай жаночай гімназіі В.М. Прозаравай. У 1907–1913 гг. працягвала навучанне на Вышэйшых жаночых курсах у Пецярбургу. Вясной 1914 г. здала дзяржаўныя іспыты пры гісторыка-філалагічным аддзяленні Імператарскага Петраградскага ўніверсітэта (цяпер – Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт). Улетку па сямейных абставінах вярнулася ў Вільню. З 1915 г. разам з Іванам Луцкевічам працавала ў Беларускім камітэце. З Антонам Луцкевічам і Алаізай Пашкевіч (Цёткай) брала ўдзел у адкрыцці першай пачатковай беларускай школы, беларускіх настаўніцкіх курсаў і Віленскай беларускай гімназіі, дзе выкладала нямецкую мову і педагогіку. У 1922 г. узяла шлюб з Лявонам Вітан-Дубейкаўскім. У сакавіку 1941 г. пасля смерці мужа і нацыяналізацыі сямейнай маёмасці як этнічная немка пераехала ў Германію. Жыла ў лагеры для перасяленцаў, потым – у Берліне, дзе працавала перакладчыцай у арганізацыі "Вінэта" і інш. У верасні 1947 г. пераехала да пляменніцы ў Малерсдорф. У 1948 г. выйшла на пенсію. У красавіку 1951 г. разам з пляменніцай пераехала ў Нюрнберг.

Аўтар успамінаў: "Лявон Дубейкаўскі" (Нью-Ёрк, 1954), "Мае ўспаміны" (пра Антона і Івана Луцкевічаў, Алаізу Пашкевіч і інш.) (Вільня, 1994) і інш.

Юльяна Вітан-Дубейкаўская памерла 28 верасня 1969 г. Пахавана на Заходніх могілках у Нюрнбергу (Westfriedhof).

Дакументы Юльяны Вітан-Дубейкаўскай паступілі ў БДАМЛМ з БІНіМа ў Нью-Ёрку ў 1999 г. У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 1, у які ўвайшлі 30 спраў (120 дак.) за 1915–1994 гг.

Вопіс складаецца з 5 раздзелаў:

У першым раздзеле – "Творчыя дакументы Ю. Вітан-Дубейкаўскай" – змешчаны артыкулы, успаміны пра А. і І. Луцкевічаў, А. Пашкевіч (Цётку) і інш. Справы складзены па жанрах і храналогіі (1953–1994).

У другім раздзеле – "Перапіска" – 2-а падраздзелы: пісьмы Ю. Вітан-Дубейкаўскай да знаёмых і пісьмы ад знаёмых і устаноў. Справы сістэматызаваны па алфавіце карэспандэнтаў і адрасатаў, унутры спраў – па храналогіі (1943–1968).

Трэці раздзел – "Дакументы да біяграфіі Ю. Вітан-Дубейкаўскай і інш." – прадстаўлены асабістымі дакументамі Ю. Вітан-Дубейкаўскай, дакументамі маёмасна-гаспадарчага характару, артыкуламі і інш. пра Ю. Вітан-Дубейкаўскую. Справы сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе (1939–1976).

У чацвёртым раздзеле – "Выяўленчыя дакументы" – змешчаны фатаграфіі Ю. Вітан-Дубейкаўскай, індывідуальныя і ў групах з сваякамі, фатаграфіі сваякоў і знаёмых, паштоўкі з краявідамі і інш. Справы сістэматызаваны па тэматычна-храналагічным прынцыпе (1915 – [1960-я гг.]).

Пяты раздзел – “Дакументы членаў сям’і Ю. Вітан-Дубейкаўскай” – прадстаўлены асабістымі дакументамі архітэктара Лявона Вітан-Дубейкаўскага (мужа) і пісьмамі Лізаветы Бакмунд (пляменніцы). Справы сістэматызаваны па храналогіі (1923–1970).

Прадмову склала
Вядучы архівіст В.Ф. Шаталава
14.02.2023

Установа “Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва”

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 15.03.2023 г.
№ 2

ФОНД № 505
ВОПІС № 1
1915–1994

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Ю. ВІТАН-ДУБЕЙКАЎСКАЙ** | | | | |
| 1 | "Чаму Іван Луцкевіч ня аставіў па сабе пісьменных працаў?". Артыкул.<br>Сшытак з аўтографам.<br>На Лл. 9-12 - чарнавікі пісьмаў Ю. Вітан-Дубейкаўскай (2) да С. Станкевіча па пытанні друку гэтага артыкула і інш. | 1954 | 12 | 3 | |
| 2 | "Рыцар Пагоні. На 75-ыя ўгодкі нараджэньня Івана Луцкевіча". Артыкул.<br>Сшытак з аўтографам.<br>На Лл. 23-26, 29-30 - чарнавікі пісьмаў Ю. Вітан-Дубейкаўскай да Я. Запрудніка (2) (ЗША) і ў рэдакцыю газеты "Бацькаўшчына" (Германія) і пісьмо С. Станкевіча ў рэдакцыю газеты "Бацькаўшчына" па пытанні друку гэтага артыкула, унясення ў яго правак (1956-1957) | 1956 | 30 | 5 | |
| 3 | "Вандроўка па Вільні", "Сяродмесьце". Артыкулы.<br>Аўтограф | [1950-я гг.] | 7 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 4 | "Мае ўспаміны".<br>Сшыткі з аўтографам (3).<br>На Лл. 200-203 - пісьмы Ю. Вітан-Дубейкаўскай (2) у БІНіМ у Нью-Ёрку з просьбай унесці змены ў рукапіс успамінаў і інш. (аўтограф) (1957) | 1953-1957 | 203 | 3 | |
| 5 | "Кароткія дадзеныя да біяграфіі Юліяны Дубейкаўскай, з дому Мэнкэ", "Вінэта".<br>Біяграфічныя ўспаміны.<br>Машынапіс.<br>На Лл. 19-20 - пісьмо Ю. Вітан-Дубейкаўскай да Р. Жук-Грышкевіч (Канада) з адначасовым зваротам да В. Жук-Грышкевіча і В. Пашкевіч, прыкладзенае да ўспамінаў (ксеракопія аўтографа) [1968] | 1966-1968 | 20 | 3 | |
| 6 | "Мае ўспаміны".<br>Друкаванае выданне (Вільня) | 1994 | 97 | 1 | |
| | * * * | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 7 | "Мае сны". Запісы за 1913-1951 гг. (з пісьмамі-зваротамі Ю. Вітан-Дубейкаўскай (2) да Я. Каханоўскай).<br>Сшытак з аўтографам | 1954 | 15 | 1/3 | |
| | **2. ПЕРАПІСКА** | | | | |
| | **2.1. ПІСЬМЫ Ю. ВІТАН-ДУБЕЙКАЎСКАЙ** | | | | |
| 8 | Паштовая картка і пісьмы да Н.А. Арсенневай (ЗША).<br>Чарнавікі | 1955-1968 | 4 | 3 | |
| 9 | Пісьмы да Я. Каханоўскай (на беларускай і польскай мовах) (ЗША).<br>Чарнавікі.<br>Адно з пісьмаў - з адначасовым зваротам да Н.А. Арсенневай - змяшчае ўспаміны пра Івана Луцкевіча і Алаізу Пашкевіч (Цётку) | 1953 - [1950-я гг.] | 29 | 6 | |
| 10 | Пісьмы да В. Пашкевіч (Канада) і В. Тумаша (3) (ЗША).<br>На Лл. 4-5 - пераклад біяграфіі Вальтэра Егера (аўтара кнігі "Weissruthenien" (Берлін, 1919), зроблены Ю. Вітан-Дубейкаўскай з нямецкай мовы на беларускую (аўтограф перакладчыцы); на Л. 10 - верш Л. Геніюш "Казак ужо ня сную..." (машынапіс) | 1954-1962 | 10 | 5 | |
| | **2.2. ПІСЬМЫ ДА Ю. ВІТАН-ДУБЕЙКАЎСКАЙ** | | | | |
| 11 | Паштоўка і пісьмо ад А. Вініцкага (ЗША) і Р. Жук-Грышкевіч (Канада).<br>Канверт ад пісьма Н. Кушаль (Н.А. Арсенневай) (ЗША) | 1954-1968 | 3 | 3 | |
| 12 | Паштовыя карткі і пісьмы ад знаёмых (на беларускай, нямецкай і польскай мовах) (Германія, Літва).<br>Да аднаго з пісьмаў прыкладзена сямейная фатаграфія, анатаваная па-польску (1943). Л. 11 | 1943-1955 | 11 | 5 | |
| | * * * | | | | |
| 13 | Пісьмо грамадскага істца ў Судовай палаце Малерсдорфа (Германія) да Ю. Вітан-Дубейкаўскай з інфармаваннем аб нераспаўсюджванні на яе "Закона аб вызваленні ад нацыянал-сацыялізму і мілітарызму ад 5 сакавіка 1946 г." (на нямецкай мове).<br>Пісьмо Упраўлення па справах уцекачоў гарадской рады Нюрнберга (Германія) да | 1947, 1954 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі справаў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Ю. Вітан-Дубейкаўскай па пытанні афармлення ёй пасведчання асобы (на нямецкай мове) | | | | |
| | **3. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Ю. ВІТАН-ДУБЕЙКАЎСКАЙ І ІНШ.** | | | | |
| 14 | Дакументы парафіянкі Евангельскай лютэранскай царквы ў Вільні на імя Ю. Вітан-Дубейкаўскай (выпіска з прыхадской кнігі аб яе нараджэнні, пасведчанне з пазнакай пакавартальных выплат за 1935-1941 гг. (на літоўскай і нямецкай мовах) | 1940, 1941 | 2 | 2 | |
| 15 | Лагерны пропуск, картка і пасведчанне "Германскага перасяленца", працоўная кніжка і інш. на імя Ю. Вітан-Дубейкаўскай (на англійскай і нямецкай мовах) | 1941-1969 | 25 | 17 | |
| | * * * | | | | |
| 16 | Квітанцыі аб грашовым ахвяраванні, зробленым Ю. Вітан-Дубейкаўскай Фундацыі нацыянальнай абароны (Fundusz Obrony Narodowej), аб аплаце прадуктаў і інш. (на нямецкай, польскай і рускай мовах) | 1939-1947 | 7 | 6 | |
| 17 | Распіска К. Менке (брата) у атрыманні грашовага пераводу ад Ю. Вітан-Дубейкаўскай (на нямецкай мове).<br>На Л. 2 - паквітаванне на гэты перавод (на нямецкай мове) | 1942 | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 18 | В. Пашкевіч. "Жыцьцёвы шлях Юльяны Дубейкаўскай",<br>С. Станкевіч. "У 75-ую гадавіну нараджэньня Юльяны Дубейкаўскай" і інш. Артыкулы і некралогі. Машынапіс, выразкі з газет | 1961-1969 | 5 | 4 | |
| 19 | Я. Запруднік. "Ю. Дубейкаўская пра "Гоман". Сцэнарый радыёперадачы.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай.<br>Прыкладзены артыкул Ю. Вітан-Дубейкаўскай "Газета "Гоман" (ксеракопія з часопіса) (1975). Лл. 5-7 | 1975, 1976 | 7 | 2 | |
| | **4. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 20 | Фатаграфіі Юльяны Вітан-Дубейкаўскай, індывідуальныя | 1934 - [1960-я гг.] | 4 | 4 | |
| 21 | Фатаграфіі Юльяны Вітан-Дубейкаўскай у групах з | 1916-1938 | 6 | 6 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Лявонам Дубейкаўскім (мужам), Ляляй Менке (у шлюбе - Кулеша) (сястрой), Эдвардам Кулешам (зяцем). Арыгіналы і копія | | | | |
| | * * * | | | | |
| 22 | Фатаграфіі Лявона Дубейкаўскага (мужа), індывідуальныя і ў групе з настаўнікамі і навучэнцамі Дзяржаўнай школы муляроў у Вільні, Лялі Менке (у шлюбе - Кулешы) (сястры), індывідуальныя і ў групе з Вальтэрам Егерам, і інш. | 1915-1935 | 7 | 7 | |
| 23 | Фотапартрэты Івана Луцкевіча. Фатаграфія магілы Івана Луцкевіча ў Закапанэ (Польшча). Арыгіналы і рэпрадукцыя | 1918-1919 | 4 | 3 | |
| 24 | Фатаграфія Вальтэра Егера (аўтара кнігі "Weissruthenien") | 1919 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 25 | Фатаграфія беларускіх вучняў Вільні ў час касцюміраванай гульні ў лесе | 1917 | 1 | 1 | |
| 26 | Фатаграфіі магілы неўстаноўленай асобы | [1930-я гг.] | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 27 | Паштоўкі з фатаграфіямі капліцы Вострабрамскага абраза Божай Маці ў Вільні, панарамы вуліцы Тадэвуша Касцюшкі ў Маладзечна, дома ўрадніка ў Свянцянах і інш. (фатограф А. Бялецкі (A. Bielecki) і інш.) | пач. XX ст. - [1920-я - 1930-я гг.] | 5 | 5 | |
| 28 | Паштоўкі з малюнкамі Герда Пауля (Gerd Paul) "Дарога ў Кальварыю ля Вільні. Жабрачкі", "Ля касцёла ў Вільні", "Па зупу" і інш., выдадзеныя "Zeitung der 10. Armee" | 1915-1918 | 7 | 7 | |
| | **5. ДАКУМЕНТЫ ЧЛЕНАЎ СЯМ'І Ю. ВІТАН-ДУБЕЙКАЎСКАЙ** | | | | |
| 29 | Дакументы Лявона Дубейкаўскага (мужа) (пасведчанне асобы (1923), пасведчанне пенсіянера для ільготнага праезду ў Варшаве (1935), квітанцыя могілак Роса ў Вільні аб продажы месца для магілы Л. Дубейкаўскага (1940) і інш. (на літоўскай і польскай мовах) | 1923-1940 | 13 | 5 | |
| 30 | Пісьмы Лізаветы Бакмунд (пляменніцы) да | 1969-1970 | 10 | 4 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Я. Каханоўскай (2) (ЗША) і В. Пашкевіч (Канада).<br>Арыгіналы і копія.<br>Паквітаванне на грашовы перавод ад В. Пашкевіч<br>Л. Бакмунд (на англійскай мове).<br>Копія | | | | |

У дадзены вопіс унесена 30 (трыццаць)

спраў з № 1 па № 30 , 120 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

вяд. архівіст ______________________ В.Ф. Шаталава

1.04.2023 г.

Дакументы прынялі:

заг.аддзела забеспячэння ______________________ В.І. Бярэйшык

захаванасці дакументаў ______________________

"_____"____________20____ г.